# УЛЮБЁНЫ Ў СВЯТЛО

## Філуменіст з Ушачаў сабраў каля 6 тысяч этыкетак

**Міхаіла БАГДАНОВІЧА можна прадставіць як кіраўніка Ушацкага дома рамёстваў. А можна — як мастака. Ён — аўтар партрэтаў Васіля Быкава, Петруся Броўкі, Рыгора Барадуліна і іншых знакамітых беларусаў, малая радзіма якіх Ушаччына. Ён быў асабіста знаёмы з Васілём Быкавым. Акрамя таго, гэты чалавек — вопытны рыбак, які не толькі ведае ўсе хітрасці лоўлі, але і сам прыдумвае снасці. Да таго ж Міхаіл Аляксандравіч — даўні падпісчык «Звязды». Але мяне ён больш за ўсё ўразіў іншай сваёй іпастассю. Міхаіл Багдановіч — калекцыянер этыкетак ад запалак. Іх у яго больш за 6 тысяч. Збірае каля 60 гадоў, пачынаючы з 1957 года.**



Міхаіл Багдановіч паказвае свае акварэлі.

### ЯШЧЭ Ў ШКОЛУ НЕ ХАДЗІЎ

Калекцыянераў запалкавых карабкоў і этыкетак называюць філуменістамі. У перакладзе гэта значыць тыя, хто «любіць святло». Суразмоўца захапіўся калекцыяніраваннем, калі яму было каля 6 гадоў.

— Тата аднойчы вырашыў не выкідваць карабок з прыгожай этыкеткай. І мне сказаў, каб паклаў куды-небудзь. Адзін, другі, трэці... І ўзнікла такім чынам маё захапленне. Родныя, перад тым як выкінуць карабок, абавязкова паказвалі мне. Калі падаліся аднолькавыя, пакідаў, каб абмяняцца з равеснікамі. Калі вучыўся пачаў у школе, перапісваўся з хлопчыкамі з Польшчы і Чэхіі. Іх адрасы дала мне настаўніца. Тады было модна падтрымліваць кантакты паміж вучнямі краін сацыялістычнага лагера. Педагогі ведалі пра маё хобі і дапамаглі знайсці аднадумцаў за мяжой. Адрас чэшскага калекцыянера і зараз магу агучыць. Для перапіскі выкарыстоўвалі слоўнікі, — успамінае Міхаіл Аляксандравіч.

Ён з настальгіяй расказвае пра «райскія часы», калі філуменісты маглі купіць калекцыі этыкетак нават у кіёсках «Саюздруку». І каштавалі яны нядорага. Напрыклад, 70 штук прадавалі за 70 капеек.

— Калі стаў студэнтам знакамітага мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута, часта наведваў краму «Філатэлія» на плошчы Перамогі ў Віцебску. Мяне там добра ведалі і пакідалі навінкі, — з гонарам расказвае калекцыянер.

Калі адпраўляўся на практыку ў іншыя гарады або ў студэнцкія атрады, прыехаўшы, абавязкова заходзіў у найбліжэйшы гастраном. У чарзе адразу звярталі ўвагу на хлопца, які прасіць паказаць яму запалкі. І цяпер ён падчас камандзіровак першай справай у крамы...

### ГІСТОРЫЯ НА ЭТЫКЕТКАХ

У савецкія часы этыкеткі былі адлюстраваннем многіх падзей. І, як сёння модна гаварыць, трэндаў.

— Напрыклад, у канцы 1950-х гадоў калорадскі жук стаў праблемай для пасеваў. І, канешне ж, гэта не маглі не адлюстраваць на этыкетках. Рэкламавалі кукурузу. Заклікалі на цаліну, потым на БАМ. На этыкетках забаранялі заплываць за буйкі. Дарэчы, вельмі шмат карыснага было надрукавана для таго, каб людзі чамусьці вучыліся. А сёння што? Супрацьпажарная агітацыя — так, добра. Але ўпэўнены, што ёсць жа не менш актуальныя тэмы... Ды і якасць этыкетак цяпер, на жаль, не таго ўзроўню, што была калісьці, — працягвае Міхаіл Аляксандравіч.

Ён адпраўляўся з прапановамі падзяліўся з прадстаўніком адной з беларускіх фабрык, дзе робяць запалкі. Выказаў гатоўнасць прапанаваць свае паслугі ў якасці мастака. Прасіў, каб прысылалі новыя этыкеткі. Але плённага супрацоўніцтва не атрымалася. Хоць мяркуе, што пасля яго званка якасць этыкетак значна палепшылася.

— А расіяне малайцы. У іх ёсць чаму павучыцца. У прыватнасці, мне вельмі падабаецца калекцыя, прысвечаная традыцыйнаму вяселлю. Чаму нашым вытворцам, напрыклад, не расказаць пра беларускія абрады, міфы, традыцыі, дасягненні? Гэта ж фарміраванне станоўчага іміджу краіны! У свеце нямала калекцыянераў... На жаль, большасць моладзі адносіцца да калекцыяніравання, як да «глупства».

Або, напрыклад, ёсць серыя з выявай гербаў беларускіх гарадоў. А ў мяне, не паверыце, няма этыкеткі, прысвечанай Ушачам. А ці ёсць такая? — задаецца пытаннем калекцыянер.

Бывае, яму прывозяць з-за мяжы карабкі. І знаёмыя ведаюць, што ён за такі падарунак будзе вельмі ўдзячны. Не абыходзіцца без казусаў. Калега пазнаёмілася з фінам і папрасіла прывезці запалкі. Той спачатку падумаў, што гэта жарт. Маўляў, грошай не хапае на запалкі. А потым шчыра смяяўся над сабой.

### ЗАПАЛКІ ЯК ДОШКА АБ'ЯЎ

Калекцыянер сабраў шмат серый па розных тэмах. Ёсць прысвечаная гісторыі савецкага кіно, юбілеям Перамогі, пакарэнню космасу, народнай творчасці, навагоднячу святу...

— Ды многа іх. Ёсць этыкеткі з выявай прадстаўнікоў флоры і фаўны, танцавальных ансамбляў. Існуюць і серыі, прысвечаныя зброі мінулых вякоў. На іншых — партрэты пісьменнікаў, паэтаў, нават літаратурных крытыкаў. Зацікаўленым паказваю і тварыі вучоных. У 1986-м надрукавалі выявы галубоў. І ўважлівы чалавек зможа навучыцца адрозніваць іх...

Як мастак і калекцыянер, Міхаіл Аляксандравіч ведае, што малюнак для этыкеткі — вышэйшы пілатаж майстэрства. Яе ствараюць з мінімумам колераў і дробных дэталяў. Гэта — калектыўная праца мастакоў і друкароў.

Этыкеткі бываюць вельмі арыгінальнымі і могуць прыносіць рэальную карысць. Напрыклад, калі ў Расіі знікненне людзей стала вялікай праблемай, пачалі друкаваць фота тых, каго шукаюць. І людзей пачалі знаходзіць.

Першая выстаўка калекцыі этыкетак Багдановіча адбылася ў 1990 годзе ва Ушачах. Потым у Наваполацку і Мінску. Некаторыя серыі былі прадстаўлены на выстаўцы «Аматарства Беларусі» — у сталіцы. Яна была прысвечаная 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны, праводзілася пад эгідай ЮНЕСКА. Этыкеткі былі адзначаныя памятным медалём.

### БЫКАЎ ЧЫТАЎ ЛЕКЦЫІ

Міхаіл Багдановіч напісаў партрэты Уладзіміра Мулявіна, Рыгора Барадуліна і Еўдакіі Лось па фота. А ў партрэце Быкава пастараўся перадаць уласнае ўражанне ад знаёмства. Пісьменнік на курсах павышэння кваліфікацыі чытаў лекцыі па літаратуры. Пашанцавала кіраўніку раённага Дома рамёстваў пачуць і Пятра Машэрава — у Доме ўрада. Ён выступаў на першым рэспубліканскім злёце студэнтаў у 1972 годзе. Тады старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Фёдар Сурганаў уручыў Міхаілу Багдановічу грамату Вярхоўнага Савета за выдатную вучобу і ўдзел у студэнцкіх будаўнічых атрадах.

Дарэчы, Дом рамёстваў ва Ушачах справіў наваселле ў новым памяшканні два гады таму. Раней гэты будынак з гаражамі ў двары належаў Дэпартаменту аховы. Кіраўніцтва раёна вырашыла, што тут будзе «правіць баль» культура. Сярод канкурэнтаў былі кавярня і аўтасэрвіс. Да пераезду Дом рамёстваў нейкім цудам размяшчаўся на карысной плошчы каля 25 «квадратаў».

Сярод экспанатаў музея народных майстроў раёна ў Доме рамёстваў — творы з дрэва Сяргея Аляксеевіча Роўбы. На жаль, майстра ўжо няма з намі. Але яго памяюць не толькі землякі.

— Калі ён упершыню пабываў на «Славянскім базары ў Віцебску», адразу стаў «героем». Журналісты, артысты, турысты здзіўляліся яго цудоўным кіям, люлькам, бюстам. А ён і скрыпкі рабіў! Пры гэтым не меў прафесійнай адукацыі. Быў вельмі незвычайным. Уявіце сабе: браў інструменты і фарбы і ў лесе рабіў нешта, а потым пакідаў... Каб мінакі ўбачылі і здзівіліся. Сястра ўмельца перадала нам у дар нямала экспанатаў. Магла б і больш, але злодзеі ўкралі з дома шмат чаго, — расказаў Міхаіл Багдановіч.

Дырэктар Ушацкага дома рамёстваў — аўтар брэнда раёна «З крыніц спрадвечных», які стаў пераможцам абласнога конкурсу на «Славянскім базары — 2015». Міхаіл Аляксандравіч намаляваў эскізы для партызанскіх землянак на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Прарыў». Некаторыя канструкцыі ўжо можна ўбачыць.

У планах Багдановіча і яго калег стварэнне казачнага дворыка каля Дома рамёстваў. Пастараюцца, каб напярэдадні навагодніх свят дзятва ўбачыла розных «дзіваў». Так што завітаеце ва Ушачы, абавязкова зірніце, што ў Багдановіча і яго каманды атрымалася. Ну і запалкі можаце прывезці, філуменіст будзе ўдзячны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Ушачы — Віцебск.*




У калекцыі Міхаіла Багдановіча ёсць і блізкія для кожнага супрацоўніка і чытача «Звязды» этыкеткі за 1961 год.



## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ АУКЦИОНЕ 15 ноября 2016 г. ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ в г. Пинске

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54079 «Деревообрабатывающий цех» |
|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-1 |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| Общая площадь (кв.м) | 3482,1 | 12954,0 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | | |
| Начальная цена (рублей) | 266 185,82 | 1 459 960,87 |
| Сумма задатка (рублей) | 26 618,6 | 145 996,1 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка | Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередач). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г. | Одно и двухэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов с бетонным покрытием 3051,3 м², сушильные камеры 6 шт., навес 72 м², циклоны 3 шт., помещение для газовой сварки со складом, санитарно-бытовые и административные помещения, асфальтобетонное и бетонное покрытие 4979 м², электрический кабель 96,7 м, ливневая и фекальная канализация 203,8 м. Ввод в эксплуатацию – 1972 г. |
| Продавец объекта | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | |
| Организатор аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | |

**Аукцион состоится 15 ноября 2016 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.**

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ликвидационной комиссией ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии», ТУП «ПриБут».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление, код 401, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – **по 14 ноября 2016 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10-ти рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням **по 14 ноября 2016 года включительно**, тел. 80165-37-16-07, тел./факс (80165) 37-16-66.

**Контактный телефон 375-29-640-80-37.**